УДК 947.6

**А.П. Бруцкі**

# Калі неба плакала крывёю

### *Сёстры Хатыні*

Гэтыя помнікі не сустрэнеш у гарадах. Не ўбачыш і ў вёсках. Самотнымі вартавымі стаяць яны паблізу бароў, рачных і азёрных берагоў, на зялёным прасторы, на зарослых густой травой лугах, пад шатамі дрэў – там, дзе няма ўжо аніякіх прыкмет чалавечага жытла, і толькі дуплісты стары дуб, сіратлівая купка бяроз ці здзічэлая сухая яблыня яшчэ нагадваюць пра тое, што людзі тут калісьці жылі...

Яны, гэтыя помнікі, падобныя адзін на аднаго, як салдаты. Звычайна гэта невысокая шэрая стэла з чырвонай зоркай і прамавугольнай таблічкай надпісу.

Нярэдка стэлы і абеліскі вянчаюць сабой нізкія курганы, сферычная форма якіх сведчыць пра штучнае паходжанне – іх насыпалі людзі.

Спыніся, чалавек, у гэтым месцы, адгані ад сябе на нейкую хвіліну звычныя турботы, успомні пра тых, хто папярэднічаў табе на гэтай зямлі, хто стаў попелам, які вечна будзе трывожыць людскую памяць... Надпісы на стэлах б'юць электрычным токам, ад якога гасне дзённае святло. Прыслухайся, чалавек, сэрцам – і расколецца раптам купал тонкага, як шкло, спакою, і пачуеш гнеўны крык мужчын, роспачнае галашэнне жанчын, горкі плач дзяцей, разлютаваны брэх драпежных аўчарак, звонкія ўдары вінтовачных стрэлаў, а пасля – завейны і грозны шум віхурнага агню, які нарастае імклівай высокай хваляй, заглушаючы ўсе гукі на зямлі і ў небе...

...Вёскі Казьяны і Роўнае прытуліліся ў вельмі маляўнічым кутку Шумілінскага раёна. Паміж імі – каля дзевяці кіламетраў. І ніякіх іншых паселішчаў. А між тым да вайны ў гэтым прамежку было цэлае гняздо вёсачак – і справа, і злева ад дарогі, уздоўж прасек, што промнямі пранізвалі змрочны лясны гушчар, багаты на ягады, грыбы, іншыя шчодрыя прыродныя дары.

Цяпер тут стаяць суровыя стэлы, пазначаючы назвы былых вёсак – Дрыжакі, Заазер'е, Зуева, Шчамілаўка, Ямішча... Усе яны – сёстры Хатыні. Пяць вёсак на дзевяць кіламетраў...

Вёскі загінулі ў сакавіку сорак трэцяга, пад час карнай аперацыі, якую гітлераўцы назвалі адпаведна – «Грамавы ўдар». Фашысты правялі яе, каб знішчыць партызанскія злучэнні ў трохвугольніку чыгуначнай дарогі Віцебск – Полацк – Невель. Асаблівага поспеху карнікі не дасягнулі – партызаны выйшлі з баямі з-пад іх ударaў, моцна пашкуматаўшы акупантаў.

І фашысты павярнулі зброю на мірнае цывільнае насельніцтва. Сілы нямецкае камандаванне кінула адборныя – цэлую ахоўную дывізію, дадаўшы чатыры ахоўныя батальёны з палка «Брандэнбург», танкавыя ўзводы, артылерыйскія і сапёрныя батальёны. Кіраваў ганебнай акцыяй Якабі – кат з генеральскімі пагонамі.

Вось гэты жорсткі і бязлітасны вал і накаціўся сакавіцкім досвіткам на ціхія вёсачкі, што спалі апошнім сваім сном... Накаціўся і патрушчыў, нібы чырвоныя лясныя суніцы... Людзі не паспелі схавацца ад лютай раптоўнай навалы, не змаглі ўратавацца ад куляў і агню. Згарэлі жывымі ў падпаленых агнямётамі хатах. Не ўцалеў, не вырваўся з пекла ніхто... І пасля вайны не было ўжо каму, разабраўшы папялішчы і знявечаныя коміны, паставіць са

смалістых зрубаў новыя хаты... Памерлі вёскі, як людзі... У Заазер'і загінула 28 жыхароў, у Зуева – 37, Дражаках – 39, Шчамілаўцы – 23, Ямішчы – 39... [1]. Развеяў вецер іх попел...

## *Кодэкс людаедаў*

У сваіх мемуарах уцалелыя гітлераўскія ваякі, каб абяліць сябе, не аднойчы спрабавалі даказаць, што метады партызанскага руху былі нецывілізаванымі, супярэчылі нейкай там ваеннай навуцы і нібыта маштабныя карныя аперацыі праводзіліся толькі таму, што немцаў на такія дзеянні наўмысна правакавалі партызаны.

Але хто і на падставе якіх законаў можа адмовіць любому народу ў святым праве змагацца за сваю зямлю і волю?

Гістарычныя факты сведчаць: генацыд у адносінах як да беларусаў, так і іншых народаў акупіраваных краін верхаводы трэцяга рэйху рыхтавалі загадзя і вельмі грунтоўна і педантычна. Вайна яшчэ не пачалася, а фельдмаршал Кейтэль 13 мая сорак першага пасылае ў войскі дырэктыву «Аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбаросы» і асобых паўнамоцтвах войск», якая фактычна здымае з ваеннаслужачых усялякую адказнасць за злачынствы на акупіраваных землях. Нага нямецкага салдата толькі ступіла на бераг Буга, а Гімлер спецыяльным цыркулярам забараняе акупацыйным уладам займацца судаводствам. Ашалелы фюрэр у патэтычным гневе крычыць усяму свету: «Хто можа аспрэчваць маё права знішчаць мільёны людзей ніжэйшай расы?» Следам рэфрэнам заклінае атлусцелы Герынг: «Забівайце, забівайце кожнага, хто супраць нас, забівайце, адказваеце не вы, а я».

Гэта быў кодэкс людаедаў, які з пачаткам вайны дапаўняўся ўсё новымі пастулатамі. Гаўляўтэр Беларусі В. Кубэ загадваў падначаленым: «Трэба быць цвёрдым, жорсткім і не задумвацца: расстрэльваць або не расстрэльваць».

І яны не задумваліся. Яны забівалі. З самага пачатку, як толькі з'явіліся, нібы д'яблы, на нашай зямлі. У вёсцы Малая Кавалеўшчына, што пад Мёрамі, схапілі вельмі аўтарытэтнага сярод мясцовага насельніцтва настаўніка Флора Данатавіча Манцэвіча. За польскім часам ён вёў сярод сялян актыўную асветніцкую дзейнасць, збіраў этнаграфічны і фальклорны матэрыял, жыў пад наглядам паліцыі. У кастрычніку 1939 года быў абраны дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі, выступіў на гэтым форуме з дакладам. Гітлераўцы некалькі сутак жорстка каталі настаўніка. ён трымаўся з выключнай мужнасцю і годна прыняў пакутніцкую смерць. У Дзісне ўжо на другі дзень пасля свайго прыходу фашысты расстралялі 10 падлеткаў – нібыта за тое, што нехта ноччу перарэзаў тэлефонную лінію.

На Лёзненшчыне акупанты адразу пачалі забіваць жанчын-актывістак. Сярод расстраляных былі дэпутат абласнога Савета працоўных Марыя Апанасаўна Чарнышова, старшыня калгаса Кацярына Піліпаўна Палітычэнка. А таксама простая свінарка Еўдакія Цярэнцьеўна Новікава, якая з'яўлялася членам ЦВК БССР. Жанчыне было за 60 гадоў. Не паглядзелі і на ўзрост...

У ліпені сорак першага масавага партызанскага руху на Беларусі яшчэ не было, ён стане такім значна пазней, а фашысты правялі ўжо першую карную аперацыю і спалілі ў Багушэўскім раёне вёскі Галашчокіна, Засценак, Навязкі, Цясы. А праз месяц штаб галоўнага камандавання сухапутных войск вермахта выдаў «Дырэктыву аб барацьбе з партызанамі», дзе выкладаецца тактыка «уціхамірвання» цывільнага насельніцтва.

Немцы, як вядома, даволі сентыментальныя, і ўся паэтычнасць іх рамантычнай натуры злавеснай экземай праступала ў назвах карных экспедыцый: «Зімовы лес», «Шаравая маланка», «Майская навальніца»,

«Веснавое свята», «Маланка», «Рэгата», «Белы мядзведзь», «Заяц-бяляк», «Зімовае чараўніцтва», «Прагулка на сёмуху»... Якія, здавалася б, прыгожыя назвы. А за імі – чорныя папялішчы, самотныя коміны дашчэнту згарэлых хат, пякельныя пакуты людзей, якіх вораг паліў жывымі...

І ўсё гэта называлася спецыфічнымі тэрмінамі – «уціхамірванне» і «фільтрацыя». Ажыццяўлялася татальнае вынішчэнне беларускага народа, і такое жахліва маштабнае, якога гісторыя да гэтага не ведала.

І які ж, аднак, цынізм – усе нялюдскія акцыі па забойству мірнага насельніцтва прыраўноўваліся да франтавых аперацый.

У верасні і кастрычніку сорак трэцяга на тэрыторыі Браслаўскага, Відзаўскага, Глыбоцкага, Мёрскага, Пастаўскага, Дунілавіцкага і Шаркаўшчынскага раёнаў фашысты правялі карную аперацыю «Фрыц». Камандавалі вельмі высокія ў іерархіі СС чыны – брыгадэнфюрэр Гарм і обергрупенфюрер Мюлер. На народных мсціўцаў кінулі танкі, авіяцыю, артылерыйскія дывізіёны. Але партызан замкнуць у блакадзе не змаглі, яны прарвалі акружэнне і выйшлі ў суседнія раёны. Без «трафеяў», аднак, няўдалыя ваякі не засталіся. Яны падрабязна пералічваюцца ў спецыяльным рапарце – 36 тысяч галоў жывёлы, 1608 цэнтнераў зерня, 4104 цэнтнеры бульбы, 1111 цэнтнераў сена і саломы. Праўда, у дакуменце не ўдакладняецца, што ўсё гэтае дабро гвалтам забрана ў мірных жыхароў. Немцы спалілі 87 вёсак, пагналі на катаргу ў фатэрлянд 12 тысяч чалавек. Усім удзельнікам марадзёрства выплацілі так званыя «франтавыя» і начапілі на брудныя мундзіры медалі «За ўдзел у баях» [1].

Рабавалі карнікі заўзята, нястомна, ахвотна, з вялікім запалам і вельмі маштабна. Адчувалася, што бачылі ў такім занятку сваё сапраўднае прызванне, лічылі, пэўна, арганічнай праявай тэўтонскага рыцарскага духу. Пасля вайны ўжо, адказваючы за свае злачынствы перад судом, генерал-лейтэнант Іаган Рыхерт, што кіраваў многімі карнымі экспедыцыямі, дэманстраваў пры паказаннях неблагую памяць, дакладна пералічваў, дзе і што яго «войска», як ён казаў, «рэквізавала». Вось запіс з пратакола судовага пасяджэння: «Рыхерт: «У час першай аперацыі мы ўзялі 557 галоў буйной рагатай жывёлы, 710 галоў дробнай, 159 свіней, другой – 186 галоў буйной рагатай жывёлы, 400 – дробнай, 58 свіней, а трэцяй – 900 кароў, 1200 – дробнай, 257 свіней».

Рыхерт камандаваў 208-й ахоўнай дывізіяй. Слова «ахоўная» тут – камуфляж. Яна, гэтая дывізія, была карнай, тут служылі забойцы.

Бухгалтарскі педантызм генерала-карніка асабліва праявіўся, калі ён праводзіў аперацыю «Зімовы лес» у Віцебскім, Гарадоцкім, Мехаўскім і Полацкім раёнах. Ужо ў першыя дні генерал накіраваў вышэйшаму начальству рапарт, у якім прасіў зняць сваю дывізію з забеспячэння тылавымі часцямі вермахта. А неўзабаве дакладваў, яўна жадаючы падкрэсліць свае заслугі перад рэйхам: «Дывізія сэканоміла для вермахта 139880 порцый гародніны, 167460 порцый мяса, 42123 меркі фуражу» [1].

А колькі пры гэтым пралілося чалавечай крыві чужога для яго народа, генерал не ўлічваў зусім. Не было такой графы ў яго пачварнай бухгалтэрыі. Генерала-марадзёра турбавала іншае – адсутнасць якіх-небудзь перспектыў далейшага рабавання сялян у Гарадоцкім раёне. Аказваецца, папярэдне сваю карную аперацыю «Клетка малпы» тут правяла 12-я танкавая дывізія, ператварыўшы раён у мёртвую зону. Рыхерт дакладваў з адчувальнай крыўдай на калег па жудаснаму рамяству, такіх жа катаў, як ён сам: «Немагчыма адшукаць жывёлу і прадукты харчавання, бо танкавая дывізія поўнасцю разбурыла вёскі».

Калі па загаду Гімлера ў жніўні і верасні сорак другога праводзілася буйнамаштабная аперацыя «Балотная ліхаманка», што паўночным флангам

ахапіла Лепельскі і Докшыцкі раёны, то ў паліцэйскія палкі, матарызаваныя брыгады, зондэркаманды СС была спушчана катэгарычная дырэктыва: «Дзейнічаць бязлітасна. Усе вёскі, якія знаходзяцца ў раёне аперацыі, падлягаюць поўнаму знішчэнню».

З не меншай жорсткасцю ажыццяўлялася «фільтрацыя» мірнага насельніцтва і пад час іншых карных аперацый. Ужо згаданыя танкісты з 12-й дывізіі ўсяго за пяць дзён закатавалі 1200 чалавек, зруйнавалі 58 вёсак, знішчаючы і дратуючы ўсё на сваім шляху.

У лютым сорак трэцяга ў Суражскім раёне гітлераўцам удалося ўзяць у палон, калі верыць рапарту, 260 партызан. Іх звязалі калючым дротам, абклалі смалой і дровамі і падпалілі. А зямлянкі, дзе хаваліся дзеці і жанчыны, закідалі гранатамі.

Маштабнай была і карная аперацыя «Зімовае чараўніцтва». У лютым сорак трэцяга фашысты загубілі ў Расонска-Асвейскай зоне 3500 чалавек, спалілі 158 вёсак. Потым самі карнікі спахапіліся, прызнаўшы сваю празмерную актыўнасць у забойстве людзей не зусім рацыянальнай. Вось як гэты матыў выкладзены ў рапарце аднаго з эсэсаўскіх камандзіраў: «Для размініравання мінных палёў няма цывільнага насельніцтва». Логіка тут садысцкая: больш практычна спачатку гнаць людзей на міннае поле, а потым ужо, пасля такой «фільтрацыі», забіць тых, каго не разарвала выбухам...

Расонска-Асвейская зона была для фашыстаў тым палігонам, дзе яны даволі інтэнсіўна выпрабоўвалі і няспынна ўдасканальвалі тактыку «выпаленай зямлі», метадычна спусташалі гэтую тэрыторыю. У дакументах акупантаў зона называлася «партызанскай рэспублікай Расоны, з якой зыходзіць далёка ідучая небяспека для ўсіх камунікацый паўночнага сектара цэнтральнага ўчастка фронту». Толькі летам сорак другога фашысты правялі ў Расонскім раёне шэсць карных экспедыцый. А ў ходзе аперацый «Ота» і «Генрых» на зыходзе сорак трэцяга і пачатку сорак чацвёртага бурылі вёскі бомбавымі ўдарамі з самалётаў. І тут зноў партызанскія брыгады з баямі прарвалі блакаду, пасля чаго вывелі з сабой у савецкі тыл дзяцей і жанчын па ўмёрзлым у лёд сплаўным лесе праз раку Нішча.

У сваіх рапартах камандзіры карных падраздзяленняў, пазбягаючы прамых указанняў на сутнасць таго, што рабілі, нярэдка ўжывалі слова «апрацаваць». Адзін з іх данесіў пад час аперацыі «Грыф», праведзенай у раёне чыгункі Віцебск-Орша: «Асоба апрацаваны больш як 400 цыган, каля 50 душэўнахворых». Гэтым займаўся, трэба меркаваць, спецыяльны батальён доктара Кнобліка.

Жахлівымі былі вынікі і карнай аперацыі «Маланка». Каля вёскі Шашы Сіроцінскага раёна немцы здолелі акружыць партызанскі атрад з брыгады імя Кароткіна. Разам з партызанамі ў лесе апынуліся тры тысячы мясцовых жыхароў. У народных мсціўцаў канчаліся патроны і гранаты. Атрад адышоў да Дзвіны. Становішча здавалася безвыходным. Але і на вайне здараюцца цуды. Якраз у гэты крытычны момант з баявога задання вярталіся савецкія штурмавікі. Лётчыкі заўважылі гітлераўцаў і абстралялі іх з брыючага палёту. Фашысты ў паніцы адступілі. Партызаны фарсіравалі Дзвіну.

Тады карнікі сталі паліць вёскі, забіўшы 567 чалавек.

### *Чынгіс-ханы дваццатага стагоддзя*

Людзі, што перажылі вайну, добра помняць, як здзіўляла іх нямецкая ўражлівасць. Салдат або афіцэр, зайшоўшы па якой патрэбе ў вясковую хату і ўбачыўшы дзяўчынку ці хлопчыка, мог раптоўна расчуліцца, прытуліць малечу да сябе, пяшчотна гладзячы па галоўцы. Даставаў з кішэні зялёнага фрэнча фотаздымак, ахвотна паказваў і з прыкметным замілаваннем тлумачыў: «Майн кіндэр». Частаваў збянтэжанага падлетка тонкай пліткай гаркаватага

нямецкага шакаладу, выдуваў на губным гармоніку жаласлівую мелодыю, ад якой вільгатнелі яго вочы...

І куды толькі знікалі ўсе гэтыя звычайныя праявы чалавечнасці, калі вымуштраваны і дысцыплінаваны нямецкі салдат прыступаў да выканання загадаў, інструкцый, цыркуляраў. Жудасны ідыятызм фашызму: звышчалавек як прадстаўнік вышэйшай арыйскай расы павінен быць бязлітасным да непаўнацэнных народаў, таму ніяк не мог заставацца проста чалавекам. Кожны нямецкі салдат меў памятку: «У цябе няма сэрца і нерваў, на вайне яны непатрэбныя, знішчы ў сабе спагаду і спачуванне». Да таго ж сам фюрэр вызваліў сваіх салдат ад сумлення, якое называў хімерай, што прыніжае воіна-арыйца.

Пад час судовага працэсу ў Мінску, у студзені сорак шостага, пракурор дапытваў Ганса Германа Коха, што ў перыяд акупацыі быў афіцэрам гестапа ў Оршы. Гітлеравец прызнаўся, што аднойчы за дзень расстраляў 10 жанчын і 8 дзяцей ад 2 да 10 гадоў. Словы гестапаўца аглушылі залу.

Пракурор спытаўся:

– Няўжо ў дзяцей былі нейкія палітычныя погляды?

– Не, вядома, але ў нас быў прынцып, каб забіваць і дзяцей.

– А ў вас дзеці ёсць? І якога ўзросту?

– Дзяцей трое. Год, тры гады і пяць гадоў.

– Іх можна абвінаваціць у нейкіх палітычных злачынствах?

– Вядома, не.

– Дык па якому прынцыпу вы расстрэльвалі дзяцей?

– Гэта было практычнае ажыццяўленне расавай тэорыі. Знішчэнне другой расы. На пачатку кожнай экзекуцыі я асабіста расстрэльваў не менш як трох чалавек, каб паказаць салдатам, што яны павінны быць стойкімі, якімі ў любых умовах абавязаны быць гестапаўцы [2].

Падпалкоўнік Эрнст Фальк камандаваў ахоўным батальёнам. Чорную памяць пакінулі яго карнікі ў Друі, Варапаеве, Дунілавічах, у вёсках Глыбоцкага раёна каля возера Шоша. На пытанне, чаму батальён знішчаў мірных жыхароў, механічна праштампаваў стандартную для гітлераўцаў фразу:

– Я атрымаў загад і выконваў яго.

– Дзяцей таксама забівалі?

– Так, – адказаў спакойна, добра завучаным тонам, якім рапартуюць вышэйшаму начальству, – быў загад знішчаць усё насельніцтва.

Палкоўнік Георг Вайсіг, полк якога спаліў на Віцебшчыне больш за 200 вёсак, таксама спасылаўся на загад: «Я разумеў, што мы паступаем бесчалавечна, насуперак усім маральным нормам, але лічыў і быў перакананым, што такая практыка была хоць і жорсткай, але правільнай» [2].

І пры гэтым – ніякіх пакут сумлення, ніякіх душэўных перажыванняў. Зрэшты, ад нічога і няма нічога. Не фізічна, а маральна яны даўно ўжо былі мёртвымі, даўно перасталі быць людзьмі.

Прыход і крах гітлераўскага фашызму быў вельмі суровым гістарычным урокам. Прэтэнзіі на сусветнае панаванне, цынічнае прысваенне сабе абсалютнага права распараджацца лёсамі іншых народаў, злачынныя глабальныя амбіцыі – усё гэта глыбока супярэчыць і логіцы гістарычнага развіцця, і пастулатам юрыдычнага права, і маральным законам, што выпрацавала чалавецтва.

Ці засвоены гэты ўрок? Генерал-маёр Герф Эбергард быў адным з тых, хто аддаваў загады ўсім гэтым бурхардам, фалькам, вайсігам, кохам.

Але на судзе не згадзіўся ўзяць на сябе адказнасць, перакінуў яе на больш высокую інстанцыю: «Быў загад без подпісу: вайну супраць СССР разглядаць як непадобную на ўсе іншыя войны. Гэтым загадам прадпісвалася паліць

вёскі, гвалтаваць жанчын. Сэнс загаду: савецкі народ знішчаць, а маёмасць адпраўляць ў Германію. Неўзабаве гэты загад быў выняты з сакрэтнай дакументацыі, баяліся, што ён можа трапіць у рукі Чырвонай Арміі».

А яшчэ генерал успомніў, што летам сорак трэцяга Гімлер, сабраўшы ў Берліне тэрміновую нараду, катэгарычна запатрабаваў ад карных кадраў дзейнічаць так, як у свой час Чынгіс-хан.

Таму сцвярджэнне, што фашызм – чума дваццатага стагоддзя, зусім не з'яўляецца метафарай. Гэта проста дыягназ.

### *Апакаліпсіс ужо быў*

У студзені сорак шостага Сцяпану Антонавічу Хверанцу было крыху больш за сорак гадоў. Але калі яго выклікалі як сведку ў залу, дзе праходзіў судовы працэс па справе аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларускай ССР, то людзі ўбачылі згорбленага, зусім сівога, прыкметна стомленага чалавека, з хваравітым і моцна маршчыністым тварам, з патухшымі вачыма. Старшыня ўважліва паглядзеў на яго і перапытаў наконт узросту. Пачуўшы адказ, колькі мінут перабіраў на стале паперы, каб супакоіцца, і толькі затым прадоўжыў разгляд справы.

Гаварыў Сцяпан Хверанц з цяжкасцю, бачна было, што яму вельмі балюча ўспамінаць той самы чорны ў яго жыцці дзень... Красавіцкім ранкам сорак чацвёртага гітлераўцы акружылі вёску Надазер'е Пліскага раёна. Сцяпан якраз быў у лесе і ўжо збіраўся вярнуцца да хаты, але, пачуўшы роспачныя крыкі людзей і заўважыўшы карнікаў, схаваўся ў хмызняку ўскрай балота. Ён бачыў усё: як немцы сагналі вяскоўцаў да канавы і пачалі страляць. Пакінулі жывым толькі мажнага мужчыну. Загадалі яму скінуць забітых людзей у канаву. А калі ён гэта зрабіў, паставілі над схілам на калені і таксама забілі стрэлам у патыліцу.

Сцяпан біўся кулакамі і галавой аб зямлю, праклінаючы сябе за ўласнае бяссілле, за тое, што не змог уратаваць ад смерці дачку, якой было толькі 18 гадоў. На яго вачах цыбаты і худы, як жэрдка, немец-карнік з усяго размаху ўдарыў дзяўчыну па галаве прыкладам вінтоўкі, а калі, як падкошаная, тая ўпала, штурхануў ботам у канаву. Яна некалькі разоў перакулілася і знікла ў чорнай, як сажа, халоднай балотнай вадзе.

Калі немцы па трупах перабраліся на другі бераг і пайшлі да наступнай вёскі, Сцяпан выбраўся з хмызняку і пачаў выцягваць людзей з канавы, складваючы іх на сухім грудку. Для яго ў гэты момант на зямлю абрынулася неба... Доўга ён сядзеў над нежывой дачкой, схапіўшыся рукамі за галаву, стагнаў, плакаў і нема крычаў, шкадуючы, што нарадзіўся калісьці на свет...

У той дзень, акрамя Надазер'я, немцы спалілі Новую Псую, Слабодку, Чашкі, Сшо, Хралы, Асінаўку, Калечполе, Вуглы, Бажкі, Пестуны...

У вёсцы Крылі нямецкія салдаты з дзікім рогатам загналі дзяўчыну ў куратнік, уварваліся следам, згвалцілі яе па чарзе, а затым падпалілі страху. Гаротніца спрабавала ратавацца, але яе аглушылі прыкладам і кінулі ў полымя, якое роем іскраў шуганула ў неба...

Пра гэта сказаў на судовым працэсе настаяцель Псуеўскай царквы Іусцін Рыгоравіч Шчасны. Гэта быў мужны чалавек. Доўга хадзіў па спаленых вёсках, падбіраў замучаных людзей ці тое, што ад іх пасля агню засталося, капаў магілы і хаваў...

Так, успаміны аб перажытым востра вярэдзілі душу. Людзі, што трапілі пад жудасны каток карных аперацый, успрымалі ў той момант з'яўленне фашыстаў як сканчэнне свету і, нейкім цудам уцалеўшы, яшчэ доўга жылі пад невыносным цяжарам такога адчування. А многія яго наогул не пазбыліся, пакутліва неслі гэты крыж: жыццё так і не вярнулася ў іх свядомасць з усімі сваімі першароднымі колерамі і фарбамі...

У сорак другім Наталлі Шчарбаковай было толькі дваццаць гадоў – вясна чалавечага веку. І былі ў яе маці, сёстры – двухгадовая Валечка, дзесяцігадовая Вера, Марыя і два браты – Віця і Коля. Усіх іх не стала 24 чэрвеня, калі карнікі аблажылі вёску Барсукі Сіроцінскага раёна. Людзі кінуліся ратавацца. Наталля паспела зашыцца ў густы хмызняк. Адтуль яна і ўбачыла, як доўгая аўтаматная чарга ў адно чорнае імгненне нібы касой падрэзала і маці, і сясцёр, і братоў. Яны разам, як яблыкі з кошыка, пападалі на зямлю. Маленькая Валечка выпала з нежывых ужо матчыных рук і засталася ляжаць нерухомай купінай. Заварушылася толькі Вера. Ёй бы стаіцца, прыкінуцца забітай, патрываць, пакуль забойцы пойдуць далей. Але, відаць, пякучы боль моцна даймаў, і яна застагнала, спрабуючы прыўзняцца. Гэта заўважыў адзін з паліцаяў. Падышоў, брыдка вылаяўся, са злосцю тузануў затвор, прыставіў рулю вінтоўкі да галавы і стрэліў у вуха... Для Наталлі скалануўся свет, яна адразу самлела... Ачуняла толькі пад вечар. Скрозь смуродны дым заўважыла кволую постаць дзяўчынкі. Гэта была 10-гадовая Каця Агрыска. У той дзень і яна страціла ўсю сваю сям'ю – бацьку, маці, дзядулю, брацікаі дзвюх сястрычак, адной з якіх было тры месяцы...

Яны ўдваіх – Наталля і Каця – сталі сцягваць забітых людзей у вялізную лагчыну. На другі дзень з'явіліся партызаны. Яны і выкапалі адну агульную на ўсіх магілу...

Як вытрымаць, ды яшчэ падлеткам, псіхалагічны ўдар такой жудаснай сілы? Пекла сапраўды апусцілася на зямлю.

Вёску Баканіха, што ў Расонскім раёне, фашысты забівалі двойчы. Першы раз – у лютым сорак трэцяга, знішчыўшы 40 мірных жыхароў. Гэтага душагубам здалося мала – здратаваная вёска яшчэ жыла. Тады яны вярнуліся глыбокай восенню, калі наваколле засыпаў снег. Ачапілі вёску і ў першы дзень расстралялі 25 чалавек. А на наступны – сагналі астатніх людзей у самую прасторную хату і падпалілі яе. Агонь хутка паглынаў страху, сцены, у густым дыме вяскоўцы пачалі задыхацца, стала сыпацца з іскрамі столь, і тады мужчыны, з усёй адчайнай сілай упёршыся ў прасценак, пахіснулі і праламалі яго. Імпэтна затахкалі нямецкія кулямёты. Пашанцавала старому ўжо Ахрэму Жыгачову. Ён паспеў кульнуцца ў сумёт, засыпаўшы сябе снегам. А многіх дасталі кулі...

Перачакаўшы, дзед Ахрэм вылез толькі тады, калі немцы з п'яным шумам ад'ехалі і спапялёную вёску накрыла жахлівым крылом мёртвая цішыня. З абгарэлымі тварам і галавой, выставіўшы перад сабой чорныя рукі, пайшоў насустрач злой завеі, якая скавытала і стагнала, кідалася драпежнай птушкай у грудзі, збівала з ног, апякала скуру лютым холадам... Раз-пораз спыняўся, падымаў апухлымі нязграбнымі пальцамі заплыўшыя павекі, каб паглядзець, куды ідзе... А куды ісці, не ведаў. Дзе ратавацца ад двухногіх звяроў? І не адразу, але зразумеў, што іншага выйсця, як вяртацца ў родную вёску, у яго няма. Там сярод згарэўшых хат ён можа ўсё ж знайсці нейкую схованку. Ды і немцы, разважаў стары, болей не прыедуць.

У спаленым гумне, дзе да вайны людзі сушылі зерне, забраўся ў ацалелую глінабітную печку. Колькі дзён і начэй праляжаў тут, то губляючы прытомнасць, то вяртаючыся да яе, нібы выплываючы з глыбокага калодзежа і зноў апускаючыся ў яго чорнае прадонне. А аднойчы пачуў чалавечыя галасы. Адзін пазнаў адразу – гэта была дачка... А потым яго доўга і ўпарта лячыла алеем і рознымі зёлкамі родная сястра.

Да вайны вёска Баканіха стаяла на маляўнічай паляне пасярод спрадвечнага баравога гушчару. І была тут сорак адна сядзіба. Пасля вайны адбудаваў сваю на ўзгорачку адзін толькі дзед Ахрэм. На прапанову пераехаць цвёрда адказваў:

– Тут нарадзіўся, тут і дажыву свае...

Не стала дзеда Ахрэма – і вёску знялі з дзяржаўнага ўліку.

***Дрэва памяці***

Да вайны ў вёсцы Зоры Лёзненскага раёна шмат было Стралковых – бацькоў і дзяцей, братоў і сясцёр – родных і стрыечных, дзядзькоў, цётак, пляменнікаў... Жылі дружна, у згодзе, ды і месца для паселішча продкі выбралі адмысловае – сярод лясоў, на маляўнічым беразе хуткаплыннай рачулкі. Але грымнула грозная навала вайны, фашысты тройчы забівалі вёску, палілі і дапальвалі ў сорак другім, і ў сорак трэцім... З мужчын загінулі ўсе – хто на фронце, хто ў партызанах, хто згарэў жывым у агні... Вайна з каранямі вырвала радавое дрэва... Засталася жывой толькі 20-гадовая Марыя Стралкова. І калі збіралася браць з каханым юнаком шлюб, то зрабіла так, як падказала памяць сэрца, – захавала дзявочае прозвішча. Муж прыняў яе боль.

За гады акупацыі гітлераўцы спалілі і разбурылі на Беларусі 9200 вёсак, 186 з попелу не адрадзілася, з іх 109 – у нас, на Віцебшчыне [3]. Пасля карных экспедыцый цэлыя раёны ператвараліся ў пустыню, вынішчаліся дашчэнту.

У Суражскім раёне з 346 вёсак засталося толькі пяць.

Асвейшчыну фашысты спалілі поўнасцю, людзей знішчылі або вывезлі ў Германію.

У 1972 годзе нашу рэспубліку наведаў вядомы амерыканскі журналіст Майкл Давыдаў. Ад таго, што ён тут пачуў і даведаўся, яму масцітаму публіцысту, стала не па сабе. Свае ўражанні выклаў у інтэрв'ю газеце «Литературная Россия»: «Цяжка адчуць поўнасцю глыбіню пакут другога, калі сам не зазнаў бязмежнасць трагедыі. Я прыйшоў да высновы, што дадзеныя аб цяжкіх вытрабаваннях Беларусі выходзяць за межы маёй здольнасці спасцігнуць і ўсвядоміць трагічнае. Чацвёртая частка яе насельніцтва забіта, 80 працэнтаў тэрыторыі ператворана ў попел. Як уявіць такое? Гэта было б падобна да цяжка ўявімай карціны: больш за 50 мільёнаў амерыканцаў забіта і ўся наша краіна разбурана, за выключэннем яе ўсходняга ўзбярэжжа».

Нам, беларусам, уяўляць такое не трэба. У нас гэта было. І цяпер святы наш клопат – не забыць, помніць.

Філосафы сцвярджаюць, што час і прастора бязмежныя. Дык, пэўна, усе тыя, што адышлі ад нас, не зніклі, як попел на вятры, а апынуліся ў нейкім таямнічым вымярэнні, недаступным нашаму разуменню. І адтуль, з гэтых загадкавых і высокіх сфер, яны, трэба думаць, уважліва і пільна сочаць за намі, толькі не могуць падаць нам ніякага знаку, і ім, вядома, крыўдна і балюча будзе назіраць, калі мы станем спакваля забываць і пра іх саміх, і пра іх пакуты, і пра тое, што гэта ім, прыняўшым такі цяжкі крыж, абавязаны мы жыццём на роднай зямлі...

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945.*** Энцыклапедыя. – Мн., 1990.
2. ***Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР*** (15–29 января 1946 года). – Мн., 1947.
3. ***Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.*** Віцебская вобласць. – Мн., 1985.



## *SUMMARY*

*The factual material collected in various areas of Vitebsk region investigate ominous practice of criminal genocide which was carried out during the Great Patriotic War by Hitler's invaders against Belarusian people, severely exterminating peace inhabitants and committing to the flames cities and villages.*


*Поступила в редакцию 26.03.2004*